# Біблія для дзяцей

прадстаўляе



# Ной і Вялікі Патоп


Аўтар: Edward Hughes

Ілюстратар: Lazarus

Пераклаў: Christian Lingua

Адаптаваў: M. Maillot; Tammy S.



Гісторыя 3 з 60

**www.M1914.org**

***Bible for Children,*** *PO Box 3, Winnipeg, MB R3C 2G1 Canada*



Ліцэнзія: Вы маеце права капіяваць ці друкаваць гэтую гісторыю, але не ў камерцыйных мэтах (не прадаваць яе).


Беларуская

Belarusian

Ной пакланяўся Богу. Усе астатнія людзі на зямлі ненавідзелі Бога і не слухаліся яго. Аднойчы Бог шакаваў Ноя, сказаўшы яму: "Я знішчу ўвесь гэты злы свет і выратую толькі тваю сям'ю".



1

Бог папярэдзіў Ноя, што прыйдзе вялікі патоп, і вада пакрые ўсю зямлю. Бог даў Ною наказ: "Пабудуй драўляны каўчэг – карабель, дастаткова вялікі для тваёй сям'і і шматлікіх жывёлін". Бог таксама даў Ною дакладныя ўказанні наконт каўчэга. Ною было, чым заняцца!



2


Калі Ной тлумачыў людзям, навошта ён будуе каўчэг, верагодна,
яны здзекаваліся з яго. Але Ной працягваў працу. Ён таксама працягваў казаць людзям пра Бога. Але ніхто не слухаў.
3
У Ноя была моцная вера. Ён верыў Богу, хоць дагэтуль дождж ніколі не падаў на зямлю. Неўзабаве каўчэг быў гатовы да таго, каб загрузіць туды пасажыраў і ўсё неабходнае.
4
Тады да Ноя прыйшлі жывёлы. З некаторых відаў Бог прывёў па сем жывёлін, з іншых толькі па двое.
5
Вялікія і малыя птушкі, малюсенькія і высокія звяры – усе яны занялі свае месца ў каўчэгу.
6
Калі Ной загружаў жывёлін у каўчэг, людзі, напэўна, выкрыквалі абразы ў ягоны адрас.
7
Яны грашылі супраць Бога і не думалі спыняцца. Яны нават і не думалі прасіць Ноя аб тым, каб ім самім увайсці ў каўчэг.
8


Нарэшце, усе жывёлы і птушкі былі на борце.
"Ной, заходзь у каўчэг разам з сям'ёй", – запрасіў Бог. Туды ўвайшлі Ной, яго жонка, тры іх сыны і іх жонкі. Потым Сам Бог зачыніў дзверы.
9
А пасля пайшоў дождж. Вялікі лівень абрынуўся на зямлю і ішоў на працягу сарака дзён і начэй. Вада разлілася па ўсіх гарадах і вёсках. Калі Дождж спыніўся, нават горы Апынуліся пад вадой. Усё, што Дыхала паветрам, памерла.
10
Калі вада ўздымалася, каўчэг плаваў наверсе, на яе паверхні. Магчыма, усярэдзіне было цёмна. Магчыма, каўчэг трэсла. Хутчэй за ўсе, там было нават страшна. Але тым не менш каўчэг захаваў Ной ад патопу.
11
Пасля пяці месяцаў патопу, Бог паслаў вецер, каб асушыць зямлю. Паступова каўчэг спыніўся высока ў гарах Арарата. Ной застаўся ўнутры яшчэ на сорак дзён, пакуль узровень вады не панізіўся.
12
Ной адкрыў акно каўчэга і выпусціў крумкача і голуба.
Голуб вярнуўся да Ноя, бо не знайшоў сухое і чыстае месца для адпачынку. Праз тыдзень Ной паспрабаваў зноў. Голуб вярнуўся з новым аліўкавым лістом у дзюбе. На наступным тыдні голуб не вярнуўся, і Ной зразумеў, што зямля ўжо высахла.
13
Бог сказаў Ною, што прыйшоў час выйсці з каўчэга. Ной і яго сям'я разам выгрузілі адтуль жывёлін.
14










Ной і Вялікі Патоп

Гісторыя з Божага Слова, Бібліі

знаходзіцца ў

Быццё 6-10

"Сведчанне словаў Тваіх прасвятляе."
Псалтыр 119:130

Бог ведае, што мы рабілі дрэнныя справы, якія Ён называе грахом. Пакаранне за грэх – гэта смерць.

Бог любіць нас так моцна, што Ён паслаў Свайго Сына, Ісуса, каб памерці на крыжы і аплаціць нашае пакаранне замест нас. Ісус уваскрэс з мёртвых і вярнуўся на нябёсы! Цяпер Бог можа прабачыць нашыя грахі.

Калі вы хочаце адвярнуцца ад вашых грахоў, тады скажыце Богу: Гасподзь, я веру, што Ісус памёр за мяне і цяпер зноў жывы. Калі ласка, увайдзі ў маё жыццё і прабач мае грахі, каб я мог мець новае жыццё цяпер, а потым быць з Табой назаўжды. Дапамажы мне жыць для Цябе, як Тваё дзіцё. Амін. Ян 3:16

Чытайце Біблію і размаўляйце з Богам кожны дзень!